Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

НАВУКА ПРЫСПЕШВАЕ ПРАГРЭС 6



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 СНЕЖНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 240 (30374)

З першых вуснаў

# «ПРАБЛЕМЫ І СКЛАДАНАСЦІ НАС ТОЛЬКІ ЎМАЦОЎВАЮЦЬ, КАЛІ МЫ НЕ СТАІМ НА МЕСЦЫ»

## Дасягнуць мільярда ў тавараабароце Беларусі і Ніжагародскай вобласці цалкам рэальна

**Саюзная тэматыка зноў у цэнтры ўвагі. Мінулы тыдзень скончыўся абмеркаваннем глабальных задач на саюзнай прасторы, новы тыдзень пачалі з супрацоўніцтва лакальнага, рэгіянальнага. Гэтымі днямі з афіцыйным візітам у Беларусі знаходзіцца дэлегацыя Ніжагародскай вобласці на чале з губернатарам Глебам Нікіціным. Графік візіту насычаны, і ключавое мерапрыемства ў ім — сустрэча з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам.**

### БУДЗЕМ СЯБРАВАЦЬ ТРАНСПАРТАМ

Вітаючы гасцей, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што адносіны паміж Беларуссю і Ніжагародскай вобласцю маюць вялікую гісторыю, яны развіваліся як пры цяперашнім, так і пры былым кіраўніку рэгіёна. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Ніжагародская вобласць значна рушыла наперад і стала адным з вядучых расійскіх рэгіёнаў. Па яго словах, беларускі бок ганарыцца тым, што мае да гэтага дачыненне. Аднак, зрабіў акцэнт Прэзідэнт, рухацца ёсць куды. «У нас 700 з лішкам мільёнаў долараў тавараабарот. Мы ставілі задачу мільярд. Я думаю, што пры нашым з вамі жыцці мы мільярда ўсё ж такі даб'ёмся. Нягледзячы на тыя праблемы і складанасці, якія сёння існуюць і, як аказалася, нас толькі ўмацоўваюць, калі мы не стаім на месцы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што беларусы і ніжагародцы плённа супрацоўнічаюць у вытворчасці электратранспарту і пасажырскага транспарту.

СТАР. 2



Фота БелТА.

# ЧАС НАШЫХ ПЕРАМОГ...



Фота БелТА.



# ...ЧАС НАШАГА АДЗІНСТВА

**Мінулыя выхадныя адзначыліся грандыёзнымі шоу ў Оршы і на «Мінск-арэне». Сярод дзясяткаў тысяч гледачоў раўнадушных і сумных не было. Уражанні — толькі пазітыўныя!**

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «ПРАБЛЕМЫ І СКЛАДАНАСЦІ НАС ТОЛЬКІ ЎМАЦОЎВАЮЦЬ, КАЛІ МЫ НЕ СТАІМ НА МЕСЦЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Беларускі лідар прапанаваў наладзіць супрацоўніцтва ў суднабудаўнічым кірунку. «Справа нават не ў тым, што мы не марская дзяржава. Мы можам сур'ёзна дапамагаць у будаўніцтве рачных суднаў. Мы нямала, па-мойму, будуеце. Мы гатовы ўдзельнічаць сваімі прадпрыемствамі прамысловасці», — адзначыў ён.

## ТРЭБА СТВАРАЦЬ БЕЛАРУСКІ ГАНДЛЁВЫ ДОМ

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, беларускі бок гатовы супрацоўнічаць у сельскай гаспадарцы. «Вы ведаеце нашы магчымасці. Гэта не толькі пастаўкі і продаж сельскагаспадарчай тэхнікі. Мы з гэтага пачыналі калісьці. Мы гатовы сумесна з вамі працаваць па вытворчасці, рамонце і абслугоўванні сельскагаспадарчай тэхнікі. Гатовы пастаўляць неабходную прадукцыю на ваш рынак. У сваю чаргу, гатовы купляць у вас неабходныя для нас прадукты», — падкрэсліў ён.

Прэзідэнт прапанаваў стварыць у Ніжагародскай вобласці гандлёвы дом з беларускай прадукцыяй: «Я думаю, што нам трэба ствараць гандлёвы дом не толькі па продажы прадуктаў харчавання. Трэба ствараць гандлёвы дом, дзе мы будзем прадаваць і прамысловыя тавары для людзей, тавары народнага спажывання і адзенне, і абутак, і халадзільнікі, і маразільнікі, і тэлевізары — усё, што неабходна для Ніжагародскай вобласці. Такі гандлёвы комплексны дом».

## ПАВІННЫ БЫЦЬ ГАРАНТЫІ

Па словах кіраўніка дзяржавы, пры падтрымцы кіраўніцтва Ніжагародскай вобласці беларускі бок гатовы рэалізаваць любы праект. «Нам трэба толькі адно — падтрымка. Гарантыі, каб мы, як часта ў нас бывала, не патанулі ў гэтай вялізнай бездані расійскай. Пачынаем працаваць з нейкім прыватным прадпрыемствам — скінуў, збег, і мы знайсці яго не можам. Таму нам патрэбны гарантыі. Надзейнасць. Мы нікуды не збяжым, таму што ў нас прадпрыемствы буйныя ў асноўным дзяржаўнай формы ўласнасці. Яны ведаюць, што трэба рабіць, і робяць. Пры такіх умовах мы гатовы працаваць з вамі па ўсіх кірунках, якія вам патрэбны для далейшага развіцця гэтай цудоўнай вобласці», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.



**Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**

**„ У нас 700 з лішкам мільёнаў долараў тавараабарот. Мы ставілі задачу мільярд. Я думаю, што пры нашым з вамі жыцці мы мільярда ўсё ж такі даб'ёмся. Нягледзячы на тыя праблемы і складанасці, якія сёння існуюць і, як аказалася, нас толькі ўмацоўваюць, калі мы не стаім на месцы. “**



**У Ніжнім Ноўгарадзе ўжо ёсць электробусы сумеснай з Беларуссю вытворчасці.**

У сваю чаргу Глеб Нікіцін заўважыў, што адносіны Беларусі і Ніжагародскай вобласці старажытныя, у прамым сэнсе гэтага слова. «Наш верны князь Аляксандр Неўскі быў жанаты на Аляксандры Полацкай (Параскеве)», — згадаў ён. Аляксандра (Параскева) Полацкая была дачкой беларускага князя Брачыслава Васількавіча. «Насамрэч гэтыя ўзаемаадносіны паміж землямі ідуць у глыбіню стагоддзяў», — сказаў Глеб Нікіцін.

«Глеб Сяргеевіч, я намёк ваш зразумеў. Цяпер Аляксандр беларускі павінен ажаніцца з вашай прыгажуняй», — пажартаваў у адказ Аляксандр Лукашэнка.

Аднак калі сур'ёзна, то, па словах Глеба Нікіціна, эканомікі Беларусі і Ніжагародскай вобласці падобныя, з розніцай у маштабах. «Высокатэхналагічны машынабудаўнічы комплекс і ў Рэспубліцы Беларусь, і ў Ніжагародскай вобласці дае магчымасць будаваць доўгатэрміновыя адносіны», — адзначыў губернатар. Ён падкрэсліў, што ў Ніжнім Ноўгарадзе размяшчаецца, напрыклад, інжынірынгавая кампанія «Атамбудэкспарт», якая займаецца будаўніцтвам атамных электрастанцый. У тым ліку яна займалася праектаваннем і каардынацыяй будаўніцтва БелАЭС. Таму, па словах Глеба Нікіціна, лічбы ўзаемнага тавараабароту ў многім былі звязаны з атамнымі праектамі, а таксама з дынамікай гандлю ў сферы вуглевадародаў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## «ГЭТА ДОБРАЯ ДЫНАМІКА, ТРЭБА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ЯЕ ЎМАЦАВАННЕ І ДАЛЕЙШЫ РОСТ»

**Тавараабарот Беларусі і Ніжагародскай вобласці за 10 месяцаў вырас на 11 % да аналагічнага перыяду 2023 года**

Такі вынік агучыў прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка падчас пасяджэння Савета дзелавога супрацоўніцтва Беларусі і Ніжагародскай вобласці.

— Мы з губернатарам напярэдадні пасяджэння абмеркавалі шэраг найбольш актуальных, гарачых пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва. Па многіх кірунках работа равіваецца актыўна, але дзесьці трэба нацiснуць. Напэўна, асноўным вынікам нашай работы бягучага года з'яўляецца развіццё ўзаемнага гандлю.

Прэм'ер-міністр паведаміў, што, па даных беларускага боку, за 10 месяцаў 2024-га тавараабарот вырас на 11 % да аналагічнага перыяду мінулага года і перавысіў 650 мільёнаў долараў у эквіваленце.

Ён акцэнтаваў увагу на важным моманце: тавараабарот збалансаваны, і экспартна-імпартныя патокі ў абодвух напрамках практычна суадносіцца.

Абмеркавалі бакі і перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва: станкабудаванне, аварыйна-ратавальная тэхніка і суднабудаванне.

✓ **Па выніках пасяджэння бакі падпісалі кантракты на суму 1 мільярд 50 мільёнаў расійскіх рублёў.**

*Таксама ў рамках візіту Глеб Нікіцін сустрэўся са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай. Падрабязнасці сустрэчы чытайце у найбліжэйшым нумары «Мясцовага самакіравання».*

## Прэс-служба Прэзідэнта паведамляе

### Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка памілаваў 29 асоб, якія ўчынілі злачынствы экстрэмісцкай накіраванасці

Усе яны раскаяліся ва ўчыненым і звярнуліся з хадайніцтвам аб памілаванні да кіраўніка дзяржавы. Гэта 11 жанчын і 18 мужчын. Сярод іх 6 чалавек — маладзейшыя за 25 гадоў, 3 пенсіянеры, 2 інваліды, 15 маюць хранічныя захворванні.

Міністэрства ўнутраных спраў забяспечыць кантроль за правапаслухмянымі паводзінамі памілаваных.

### Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 9 снежня падпісаў Указ нумар 459 «Аб прадстаўленні Рэспублікі Беларусь на міжнародных мерапрыемствах»

У адпаведнасці з указам з 1 сакавіка 2025 года выкарыстанне слоў «Рэспубліка Беларусь», «Беларусь», «нацыянальны», «беларускі» ў назвах культурных, спартыўных і адукацыйных мерапрыемстваў, мэтай якіх з'яўляецца адбор асоб для іх падрыхтоўкі да ўдзелу і (або) для ўдзелу ў міжнародных мерапрыемствах ад імя Рэспублікі Беларусь, дапускаецца толькі ў тым выпадку, калі арганізатарам мерапрыемства выступае дзяржаўная арганізацыя.

Нацыянальная школа прыгажосці надзяляецца статусам адзінага каардынатара па арганізацыі і правядзенні Нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь», адбораў прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь для ўдзелу ў міжнародных конкурсах прыгажосці.

Указам таксама вызначаецца парадак удзелу прадстаўнікоў Беларусі ў міжнародных культурных, спартыўных, адукацыйных мерапрыемствах, дакументамі аб правядзенні якіх прадугледжана прадстаўніцтва дзяржавы толькі адной асобай (калектывам).

Прадстаўленне Рэспублікі Беларусь на такіх мерапрыемствах фізічнай асобай або камандай стане магчымым пры ўмове праходжання імі нацыянальнага адбору ці накіравання іх для ўдзелу дзяржаўнай арганізацыяй або паведамлення ў дзяржаўны орган аб намеры прыняць удзел у такім мерапрыемстве.

Гэтыя нормы дадуць магчымасць забяспечыць абарону інтарэсаў нашай краіны і ажыццяўляць на самым высокім прафесійным узроўні падрыхтоўку нацыянальных удзельнікаў да значных міжнародных мерапрыемстваў.

❍ У тэму

## Глеб Нікіцін: «Мы ў частцы нашага супрацоўніцтва настроены аптымістычна»

У размове з журналістамі Глеб Нікіцін назваў дынаміку развіцця адносін Беларусі і Ніжагародскай вобласці неверагоднай. «Гэта звязана з тым, што шмат у чым нашы эканомікі падобныя. І тая і іншая эканомікі грунтуюцца на высокатэхналагічных апрацоўчых галінах, таму шмат сувязяў у прамысловасці», — сказаў ён. Сумесным флагманскім праектам ён назваў фарміраванне рухомага саставу для рэформы гарадскога электратранспарту ў Расіі. «Мы з'яўляемся рэгіёнам — абсалютным лідарам па гэтай рэформе. Пры падтрымцы ўрада Расіі мы набываем 120 электробусаў беларускай вытворчасці. У нас будзе самы вялікі парк электробусаў пасля Масквы», — падкрэсліў Глеб Нікіцін. Рэгіён таксама дамовіўся аб набыцці ў Беларусі 170 трамваяў.

Губернатар Ніжагародскай вобласці звярнуў увагу, што кожны яго прыезд у Беларусь або правядзенне Савета дзелавога супрацоўніцтва ў Ніжнім Ноўгарадзе адзначаецца новым этапам і новым канкрэтным праектам. Напрыклад, па выніках папярэдніх яго сустрэч з Прэзідэнтам Беларусі быў падпісаны кантракт па стварэнні новай вытворчасці трамваяў, электробусаў. Да канца гэтага года ўся партыя з 62 электробусаў, выраблены сумесна, будзе пастаўлена для патрэб Ніжняга Ноўгарада.

Яшчэ адным прыкладам беспрэцэдэнтнага характару ўзаемаадносін Глеб Нікіцін назваў рашэнне беларускага лідара аб тым, што Савет дзелавога супрацоўніцтва з беларускага боку ўзначаліць прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка. Таксама чарговы Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі будзе прымаць Ніжні Ноўгарад. Мяркуецца, што падчас форуму будзе адкрыта Генеральнае консульства Беларусі.

«Сёння з Прэзідэнтам абмяркоўвалі праекты ў сферы суднабудавання, у галіне хімічнай прамысловасці ў гуманітарнай сферы. Мы вельмі шануем узровень нашых гуманітарных адносін. У гэтым годзе мы ўпершыню правялі форум ВНУ Саюзнай дзяржавы ў Ніжнім Ноўгарадзе, — падкрэсліў Глеб Нікіцін. — Мы ў частцы нашага супрацоўніцтва настроены аптымістычна. І я вельмі цаню, што Аляксандр Рыгоравіч сам вядзе ўсе праекты, падтрымлівае і адзначае наша ніжагародскае імкненне да далейшага ўмацавання адносін з беларускімі партнёрамі».

Што да адкрыцця гандлёвага дома, то, паводле слоў Глеба Нікіціна, гэта пытанне ўжо прапрацоўваецца. Ужо нават падабрана месца для размяшчэння цэнтра. «Нам гэта выключна цікава. Гэта павінен быць сучасны варты нашага супрацоўніцтва і беларускіх вытворцаў цэнтр. Цяпер чакаем канчатковых рашэнняў. Мы гатовы да таго, каб адкрыць у сябе такі цэнтр», — сказаў губернатар Ніжагародскай вобласці.

# ТРЭК НА РАЗВІЦЦЁ

## Раман Галоўчанка: «Аналагаў Саюзнай дзяржаве ў сусветнай практыцы няма»

**Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка падчас урачыстага мерапрыемства з нагоды 25-й гадавіны падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета, якое адбылося ў нядзелю, 8 снежня.**

— Сёння дзень вялікай без перабольшання значнасці ў гісторыі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Роўна 25 гадоў таму нашы краіны выбралі ўнікальны шлях сумеснага развіцця ў фармаце Саюзнай дзяржавы, аналагаў якой няма ў сусветнай практыцы, — адзначыў Раман Галоўчанка.

Прэм'ер-міністр зачытаў зварот да народаў Беларусі і Расіі з нагоды 25-годдзя Дагавора аб Саюзнай дзяржаве Старшыні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел вышэйшыя службовыя асобы Рэспублікі Беларусь, кіраўнікі дзяржаўных органаў і арганізацый нашай краіны, Расійскай Федэрацыі, іншыя запрошаныя. У праграме — опера М. Мусаргскага «Хаваншчына» ў пастаноўцы Дзяржаўнага акадэмічнага Марыінскага тэатра.

**Паводле БелТА.**

❍ У тэму

**Прэм'ер-міністр расказаў, аб чым прэзідэнты і прэм'еры Беларусі і Расіі гаварылі ўчатырох** непасрэдна перад пачаткам пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, які прайшоў у Мінску ў пятніцу, 6 снежня. Адказ на пытанне журналістаў аб гэтай міні-нарадзе паказалі ў эфіры навін тэлеканала «Беларусь 1».

Аляксандр Лукашэнка, Уладзімір Пуцін, Раман Галоўчанка і Міхаіл Мішусцін былі заўважаны журналістамі за абмеркаваннем нейкіх пытанняў у кулуарах Палаца Незалежнасці непасрэдна перад пачаткам пасяджэння. У беларускага прэм'ера калегі паспрабавалі даведацца, аб чым жа менавіта ішла размова.

— Ёсць некаторыя пытанні. Але пакінем гэта пакуль паміж удзельнікамі гэтай міні-нарады. Гэта ўсе эканамічныя пытанні, бягучая сітуацыя. Усё пазітыўна, але канфідэнцыяльна, — патлумачыў Раман Галоўчанка.

Урок памяці

# Месца смутку і адукацыйная платформа








**Патрыятычная акцыя — урок «Лёсы дзяцей вайны» — аб'яднала ўсе ўстановы адукацыі Гомельшчыны. Яе старт быў аб'яўлены на ўроку памяці з удзелам прэм'ер-міністра Беларусі Рамана ГАЛОЎЧАНКІ ў новым музеі «Дзецям — ахвярам вайны».**

Прэм'ер-міністр Беларусі ўзяў удзел ва ўрачыстым адкрыцці музейнага комплексу на тэрыторыі мемарыяла «Дзецям — ахвярам вайны» ў Красным Беразе Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. Тут створана экспазіцыя, адзіная ў сваім родзе ў краіне.

— На гэтым месцы мы ўспамінаем цяжкую трагедыю, якую перажыў наш народ, нашы беларускія сем'і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Больш за 200 беларускіх гарадоў і вёсак былі спустошаны і спалены дашчэнту. Пра тыя крывавыя злачынствы не даюць забыць шматлікія помнікі на нашай зямлі. Дзякуючы намаганням нашага народа ніводнае з такіх журботных месцаў не засталося невядомым. Сёння там стаяць мемарыялы, якія ўвасобілі ўвесь наш смутак аб сотнях знішчаных населеных пунктаў і мільёнах чалавечых жыццяў, — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Памяць аб больш як двух тысячах малалетніх вязняў ушанавана ў музеі мемарыяльнага комплексу ў Красным Беразе. Тут у 1944 годзе нямецка-фашысцкія захопнікі арганізавалі зборны пункт, у які звазілі дзяцей ад 8 да 14 гадоў, выкарыстоўвалі іх як донараў і для адпраўкі ў Германію. У памяць аб малалетніх ахвярах у 2007 годзе быў адкрыты мемарыяльны комплекс. У мінулым годзе Гомельскі аблвыканкам прыняў рашэнне правесці бягучы рамонт мемарыяла і прылеглай тэрыторыі, а таксама пабудаваць новы будынак музея.




Як адзначыў Раман Галоўчанка, аблічча мемарыяльнага комплексу не дае забыцца пра тое, што ў першую чаргу тут перададзены дзіцячыя мары, якім так і не наканавана было спраўдзіцца.

— Але самае галоўнае, што мемарыял у Красным Беразе — гэта магутны заслон бяздушным спробам перавярнуць гісторыю, зняславіць нашу Вялікую Перамогу, пакуты нашага народа, зганьбіць светлую памяць усіх тых, хто загінуў у той страшнай вайне, — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Прэм'ер-міністр стаў удзельнікам першага ўроку памяці «Лёсы дзяцей вайны» ў новым музейным комплексе. Былі закрануты тэмы крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, захавання памяці аб ваеннай гісторыі ў Беларусі і Расіі і іншыя.

Раман Галоўчанка нагадаў, што на Захадзе з тых, хто прынёс бяду на нашу зямлю, удзельнічаў у бясчынствах, сёння спрабуюць рабіць новых герояў.

— Усе гэтыя спробы, якія адбываюцца ў цяперашні час, далёка не бяскрыўдныя. Гэта не проста нейкія гістарычныя спрэчкі ці спробы новай трактоўкі падзей. Гэта спланаваныя мерапрыемствы ідэалагічных дыверсій супраць нашай агульнай памяці, каб мы пазбавіліся тых апор, на якіх будуем нашу ўласную ідэалогію, ідэалогію нашай дзяржавы, супраць ролі ўсяго савецкага народа, беларускага народа ў вызваленні свету ад самага страшнага зла ў гісторыі чалавецтва — фашызму, — сказаў падчас урока памяці Раман Галоўчанка.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота БелТА.**



Заканатворчасць

# Змякчэнне пакарання і індывідуальны падыход

### На экспертным савеце ў Савеце Рэспублікі абмеркавалі законапраект «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці»



**Законапраект, па словах Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ, па даручэнні Прэзідэнта шырока абмяркоўваўся ў працоўных калектывах, з удзелам грамадскасці. Прапанаваныя змяненні забяспечваюць індывідуалізацыю крымінальнай адказнасці, узмацняюць гуманістычную накіраванасць крымінальнага заканадаўства, гарантуюць збалансаванасць яго норм.**

Дакументам карэкціруюцца палажэнні Крымінальнага, Крымінальна-працэсуальнага і Крымінальна-выканаўчага кодэксаў Рэспублікі Беларусь, Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.

У прыватнасці, перагледжаны санкцыі каля 130 складаў злачынстваў, у тым ліку каля 70 складаў дапоўнены альтэрнатыўнымі відамі пакарання. Па шэрагу злачынстваў, у тым ліку эканамічнай накіраванасці, прадугледжваецца змякчэнне пакарання. Ёсць прапанова не прымяняць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі да жанчын і адзінокіх мужчын, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў, а таксама да непаўналетніх і інвалідаў пры ўмове, калі злачынства ўчынена імі ўпершыню і не звязана з замахам на жыццё і здароўе чалавека або экстрэмісцкай дзейнасцю.

Як звярнуў увагу ў размове з журналістамі **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Сяргей ХАМЕНКА,** законапраект прайшоў усе стадыі абмеркавання на ўсіх узроўнях. «Пачынаючы з дыялогавых пляцовак у калектывах, працоўных груп, дзе спецыялісты выказвалі, з аднаго боку, свае меркаванне, з другога — перспектыўна прагназавалі і мадэлявалі варыянты развіцця падзей у выпадку прыняцця гэтага закона, — канкрэтызаваў ён. — Парламентарыі, эксперты, якія працуюць над законапраектам, робяць усё для таго, каб ніякіх негатыўных наступстваў пры прыёме палажэнняў нарматыўнага прававога акта не было».

У аснове законапраекта — змяненні тэрмінаў пакарання за шматлікага роду злачынствы. Гэта, па словах намесніка старшыні Савета Рэспублікі, сведчыць аб сацыяльным падыходзе ў адносінах да людзей як судовых органаў, так і органаў унутраных спраў, сілавых структур і іншых. Пры гэтым Сяргей Хаменка заўважыў, што ў Беларусі ўзровень злачыннасці адзін з самых нізкіх у краінах СНД.

Па словах сенатара, практыка правядзення экспертных саветаў пры Савеце Рэспублікі з'яўляецца ўзорам юрыдычнага алгарытму, які склаўся ў нашай краіне і працуе для народа. Сяргей Хаменка падкрэсліў, што сумесны разгляд законапраектаў — гэта прыклад эфектыўнага ўзаемадзеяння дзвюх палат парламента. «Многія зайздросцяць той практычнай рэалізацыі законаў, якая склалася ў нас у краіне, — удакладніў ён. — Гэта самая лепшая ацэнка».

Акрамя таго, члены экспертнага савета разгледзелі праект Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь». Дакументам карэкціруецца Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 снежня 2006 г. № 719 «Пытанні цэнтральных органаў ваеннага кіравання Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь». Праект указа накіраваны на прывядзенне палажэнняў аб Міністэрстве абароны і Генеральным штабе Узброеных Сіл у адпаведнасць з Ваеннай дактрынай Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, удакладняецца прынцып размежавання паўнамоцтваў Мінабароны і Генеральнага штаба па пытаннях гарантавання ваеннай бяспекі і абароны.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

Міжпарламенцкі дыялог

# «Парламенцкая дыпламатыя — сімбіёз афіцыйнай і народнай дыпламатыі»

### Аб чым гаварыў Ігар СЕРГЯЕНКА на сумесным пасяджэнні Савета і 17-м пленарным пасяджэнні Парламенцкай асамблеі АДКБ у Маскве



**Старшыня Палаты прадстаўнікоў нагадаў, што Прэзідэнт Беларусі на сесіі Савета калектыўнай бяспекі, якая адбылася 28 лістапада ў Астане, падкрэсліў, што АДКБ павінна стаць адной з ваенна-палітычных апор архітэктуры бяспекі Еўразійскага кантынента, якая фарміруецца, задаваць трэнд парадку дня рэгіянальнай бяспекі. Контуры гэтай архітэктуры бяспекі, па словах спікера, закладзены ў Еўразійскай хартыі разнастайнасці і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі — дакуменце, падпісаным кіраўнікамі знешнепалітычных ведамстваў Беларусі і Расіі ў Брэсце ў лістападзе бягучага года. Гэтая ініцыятыва, па меркаванні Ігара Сергяенкі, павінна паскорыць працэсы палітычнай, эканамічнай і іншай кансалідацыі ў мэтах забеспячэння бяспекі, стратэгічнай стабільнасці і прагрэсіўнага развіцця краін і народаў.**

## «Важна пашыраць супрацоўніцтва з вядучымі сусветнымі аб'яднаннямі»

«Кіраўнік нашай дзяржавы заклікаў «адысці ад забабонаў і стэрэатыпаў і пачаць карпатліва выбудоўваць дыялог, крок за крокам шукаць кропкі судакранання і збліжэння», — канстатаваў Ігар Сергяенка. — Ён выступіў за стварэнне агульнай прасторы даверу і супрацоўніцтва, за аб'яднанне краін не супраць каго-небудзь, а ў імя агульнай мэты, каб пазбегнуць фатальнага цывілізацыйнага разлому. Ключавы прынцып пабудовы новай сістэмы заключаецца ў непадзельнасці бяспекі: бяспека адных не можа забяспечвацца за кошт бяспекі іншых».

Па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, гэты тэзіс поўнасцю адпавядае духу АДКБ, пазіцыі лідараў дзяржаў, якія заклікаюць адысці ад блокавага мыслення і сканцэнтраваць намаганні на ўстараненні сапраўдных пагроз сучаснаму свету. «Гэта эканамічная няроўнасць Поўначы і Поўдня, кліматычныя змяненні і абмежаванне доступу да зялёных тэхналогій, міжнародны тэрарызм і арганізаваная злачыннасць, — канкрэтызаваў ён. — На жаль, пералік гэтых праблем даволі шырокі».

Свой уклад у пабудову роўнай непадзельнай еўразійскай бяспекі, як падкрэсліў Ігар Сергяенка, можа і абавязана ўнесці парламенцкая дыпламатыя, якая, па сутнасці, з'яўляецца сімбіёзам афіцыйнай і народнай дыпламатыі. «Выказаная кіраўнікамі дзяржаў у ходзе нядаўняй сесіі Савета Калектыўнай бяспекі АДКБ у Астане ідэя актывізацыі дыялогу еўразійскіх шматбаковых міжнародных арганізацый павінна атрымаць усямерную падтрымку Парламенцкай асамблеі АДКБ, — пераканаНы спікер. — Размова ідзе перш за ўсё аб АСЕАН, АДКБ, ШАС, СНД, Нарадзе па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі. Важна таксама пашыраць супрацоўніцтва з вядучымі сусветнымі аб'яднаннямі. Мы вітаем прыняцце ў лістападзе бягучага года на 79-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН рэзалюцыі аб супрацоўніцтве паміж Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і АДКБ».

## «Павінен гучаць голас праўды і розуму»

Старшыня Палаты прадстаўнікоў нагадаў, што нядаўна жыхары нашай краіны адзначылі 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У наступным годзе будзе адзначацца 80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. «З гэтай вайны мы вынеслі галоўны ўрок: нацызм — абсалютнае зло, — падкрэсліў Ігар Сергяенка. — Злачынствам фашыстаў няма і не можа быць апраўдання і прабачэння. Ні тады, ні цяпер, ні ў будучыні. Перад цяперашнім пакаленнем стаіць не менш сур'ёзная задача — не дапусціць фальсіфікацыі гісторыі, рэвізіі вынікаў вайны і прыніжэння ролі савецкага народа ў вызваленні Еўропы ад «карычневай чумы». Мы бачым, як у краінах Захаду разбураюць помнікі савецкім воінам, узводзяць мемарыялы нацыстам і іх памагатым, ушаноўваюць ветэранаў СС і, што асабліва небяспечна, рыхтуюць грамадскае меркаванне да новага паходу на Усход».

У сувязі з гэтым спікер назваў своечасовым запланаванае на пасяджэнні прыняцце звароту ПА АДКБ да народаў дзяржаў — членаў арганізацыі і парламентарыяў краін свету ў сувязі з 80-годдзем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

**«Ва ўмовах татальнай мілітарызацыі планеты, імклівай дэградацыі міжнароднага права і адмовы Захаду ад прынцыпу непадзельнасці бяспекі павінен гучаць голас праўды і розуму, — заявіў ён. — Адной з прычын новай сусветнай вайны, у якую нас спрабуюць уцягнуць, з'яўляецца крах заходняй, каланіяльнай па сваёй сутнасці, мадэлі эканамічных адносін, менавіта таму краіны глабальнай большасці спрабуюць выбудаваць справядлівую, шматбаковую сістэму, у якой няма месца пратэкцыянізму, нелегітымным санкцыям і палітызацыі эканамічных адносін».**

На пляцоўцы сумеснага пасяджэння Савета і 17-га пленарнага пасяджэння Парламенцкай асамблеі АДКБ Старшыня Палаты прадстаўнікоў запрасіў дэлегацыю ПА АДКБ узяць удзел у назіранні за выбарамі Прэзідэнта Беларусі. Парламенцкая асамблея АДКБ прагаласавала за прыняцце гэтага запрашэння.

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

## Дарэчы

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка 16 снежня правядзе асабісты прыём грамадзян, паведамілі ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў.**

**Папярэдні запіс будзе ажыццяўляцца 10 і 11 снежня з 8.00 да 17.00 (перапынак 13.00 — 14.00).**

**Тэлефон для запісу: 8 (017) 222-69-25.**



# АДЗІНСТВА РОБІЦЬ НАС МАЦНЕЙШЫМІ

**Рэспубліканская грамадска-культурная акцыя «Марафон адзінства» працягвае вандраваць па краіне. У мінулую суботу жыхары і госці Оршы развіталіся з акцыяй, спадзеючыся на новую сустрэчу. Чым былі насычаны два дні «Марафону» ў горадзе — у нашым рэпартажы.**














## ФАБРЫКІ — РАБОЧЫМ І ТВОРЧАСЦІ

У рамках праекта «Адну справу робім» 6 снежня ў госці да работнікаў Аршанскага льнокамбіната прыехалі іх калегі з ААТ «Сцяг індустрыялізацыі». Гендырэктар ільнокамбіната Алег Буянаў і дырэктар ААТ «Сцяг індустрыялізацыі» Кацярына Моўчан выказалі словы падзякі арганізатарам праекта за магчымасць акунуцца ў атмасферу свята, а работнікі прадпрыемстваў змаглі задаць кіраўніцтву пытанні. Творчым падарункам для ўдзельнікаў праекта стала выступленне гурта «Аўра».

Абмеркаванне аграрных планаў на будучыню прайшло на базе агракамбіната «Юбілейны»: калектыў сельгаспрадпрыемства сустрэўся з работнікамі ААТ «Оршааграмаш». Не абышлося на агракамбінаце без заслужаных узнагарод, кветак і падзяк. Яркім музычным сюрпрызам для работнікаў двух прадпрыемстваў стала выступленне Аляксандры Мелех і Яўгена Ермалковіча.

«Разам працуем, разам спяваем!» — яшчэ адзін праект акцыі, прысвечаны працаўнікам. Такая творчая эстафета ў Оршы прыйшла на станказавод «Чырвоны барацьбіт», завод «Легмаш» і ААТ «Аршанскі інструментальны завод». Сапраўдным падарункам для завадчан сталі выступленні заслужанага артыста Беларусі Аляксандра Саладухі, народнага артыста Беларусі Уладзіміра Громава, арт-гурта «Брэнд.бай», Вольгі Булай і іншых зорак айчыннай эстрады.

Не хаваў эмоцый ад канцэрта самы дасведчаны шліфоўшчык станказавода «Чырвоны барацьбіт» Аляксандр Шынкевіч. «За 52 гады працы на прадпрыемстве такое бачу ўпершыню. Усё як на сапраўдным канцэрце. Складана словамі перадаць атмасферу таго, што адбываецца. Гэта цудоўна!» — падзяліўся Аляксандр.

## РАЗМОВА АБ ГЕРОЯХ

У рамках «Знакавай сустрэчы» перад маладым і сталым пакаленнем выступілі гендырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін, журналіст Рыгор Азаронак, старшыня Беларускай федэрацыі веласіпеднага спорту, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў па веласпорце Наталля Цылінская, галоўны рэдактар «Альфа Радыё» Вадзім Шэпет.

Спікеры гаварылі з аўдыторыяй не толькі пра герояў Вялікай Айчыннай вайны, але і пра нашых сучаснікаў. Пра тых, хто аддаў жыцці за Радзіму і пра тых, хто здзяйсняе сапраўдныя ўчынкі, годныя называцца подзвігам. Успаміналі пра супрацоўніка Камітэта дзяржбяспекі старшага лейтэнанта Дзмітрыя Федасюка, 12-гадовага Рому Кагадоўскага, паралімпійца Аляксея Талая, касманаўта Марыну Васілеўскую, лётчыкаў Андрэя Нічыпорчыка і Мікіту Куканенку. І пра тых герояў, імёны якіх на Віцебшчыне ведае кожны школьнік: Веру Харужую, Канстанціна Заслонава.

## У ГОНАР «КАЦЮШЫ»

7 снежня цэнтрам прыцягнення для ўсіх жыхароў і шматлікіх гасцей Аршаншчыны стала пляцоўка перад хакейным клубам «Лакаматыў-Орша». Вялікую цікавасць у маладога і сталага пакаленняў выклікалі інтэрактыўныя пляцоўкі Міністэрства абароны. Самай яркай і запамінальнай стала выстава сучаснай ваеннай тэхнікі, якая стаіць на ўзбраенні нашай краіны.

Дарэчы, Орша на «Марафоне адзінства» — першая лакацыя, дзе Міністэрства абароны ўзяло ўдзел у такім фармаце. «Тут упершыню паказваецца ваенна-спецыяльная тэхніка, а таксама прыклады і магчымасці ваенных факультэтаў і Ваеннай акадэміі. Спадзяёмся, што арганізатары прымуць рашэнне працягнуць наш удзел у іншых гарадах, дзе пройдзе акцыя. Орша — адзін з самых пацярпелых гарадоў падчас Вялікай Айчыннай вайны. У гады 80-годдзя вызвалення Беларусі гэта мае асаблівае значэнне», — расказаў **ваенны камісар Віцебскай вобласці палкоўнік Дзмітрый ВАЛЬФОВІЧ.**

Плац-канцэрт аркестра Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь прымусіў аршанцаў не толькі пусціцца ў скокі, але і падпяваць савецкім і сучасным хітам у выкананні курсантаў. На мемарыяле «За нашу Савецкую Радзіму», дзе ўсталяваны макет баявой машыны «Кацюша», разам з аркестрам аршанцы праспявалі аднайменны хіт.

## АДЗІНЫЯ — ЗНАЧЫЦЬ, БУДЗЕМ ЖЫЦЬ!

Яркім акордам «Марафону адзінства» ў Оршы стаў гала-канцэрт «Час выбраў нас». Да шматтысячнай залы Лядовай арэны са сцэны звярнуўся **Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Дзмітрый КРУТОЙ.** «Наўрад ці ёсць беларус, які б хоць раз не быў праездам у Оршы. Сімвалічна, што сярэдзіна акцыі «Марафон адзінства» праходзіць менавіта тут. Орша — гэта горад, дзе жывуць патрыёты і працавітыя людзі, якія прадстаўляюць разнастайнасць нашай вялікай краіны», — падкрэсліў ён.

Дзмітрый Крутой нагадаў гледачам, колькі сіл прыклаў Прэзідэнт для таго, каб сёння Аршанскі раён стаў не толькі камфортным і прывабным для жыцця, але і прамыслова моцным.

Дзве гадзіны музычныя і харэаграфічныя падарункі аршанцам дарылі звыш 500 артыстаў. На сцэне выступілі папулярныя беларускія выканаўцы: Ірына Дарафеева, Анатоль Ярмоленка, арт-група «Беларусы», Юлія Быкава і Яўген Алейнік, Яўген Курчыч і Ганна Благава, прафесійныя і аматарскія калектывы Віцебскай, Брэсцкай і Гомельскай абласцей. Сімвалічна, што ўраджэнцы Аршаншчыны — Самір Ёлчыеў і Уладзімір Правалінскі — таксама віталі са сцэны ўдзельнікаў свята.

«За амаль тысячагадовую гісторыю Орша была сведкай вялікай колькасці падзей. Тут стваралі першы беларускі буквар, тут быў першы залп «Кацюшы». Орша — гэта горад-працаўнік, горад-патрыёт, горад тэкстыльшчыкаў, ільнаводаў, машынабудаўнікоў. І гэтая зямля з'яўляецца малой радзімай Прэзідэнта, чыё імя ўжо стала сімвалам росквіту. «Марафон адзінства» кранае самыя таемныя струны нашай душы на кожным канцэрце. Дзякуй тым, хто робіць для нас гэта цудоўнае свята. Вы ў такой простай, даступнай форме кажаце пра тое, што галоўнае для нас — паразуменне, сяброўства, любоў і, вядома ж, адзінства. І толькі дзякуючы гэтым якасцям мы зможам зрабіць яшчэ лепшай нашу краіну, наша месца, дзе мы нарадзіліся і жывём», — падзякаваў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.**

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота БелТА.**

***Далей мы без навукі развіваць краіну не зможам. Усё, што мы маглі выціснуць інтэнсіўна і экстэнсіўна з таго, што ў нас ёсць у краіне, перш за ўсё ў эканоміцы, мы ўжо зрабілі. Далей трэба развівацца, абапіраючыся на навуку. Без навукі — нікуды. Інвестыцыі ў навуку і тэхналогіі сталі ключавой умовай дабрабыту дзяржавы, залогам паступальнага канкурэнтнага развіцця.***

*Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з рабочай групай па аналізе дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук. 3 снежня 2024 года.*

## У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ІНАВАЦЫІ ДЛЯ ЭКАНОМІКІ

### Старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей ШЛЫЧКОЎ:

**«З улікам неабходнасці павышэння практыкаарыентаванасці навуковых даследаванняў, аб якой сёння гаворыцца на самым высокім дзяржаўным узроўні, найбольш перспектыўныя кірункі развіцця — гэта інавацыі для машынабудавання і нафтаперапрацоўкі, будаўніцтва і медыцыны, лёгкай, харчовай прамысловасці, АПК і гэтак далей.**

Першым прыярытэтам мы бачым, як і ў бягучай пяцігодцы, усё, што звязана з лічбавізацыяй і тэхналогіямі штучнага інтэлекту. У Прагнозе навукова-тэхнічнага прагрэсу дадзена інфармацыя аб перспектыўных варыянтах выкарыстання штучнага інтэлекту, а таксама аб стане навукова-тэхналагічнай інфраструктуры для гэтага.

Дакумент прагназуе стварэнне шырокага пераліку тэхналогій атрымання новых матэрыялаў з зададзенымі ўласцівасцямі для вытворчасці тканін і абутку. Для дрэваапрацоўчай прамысловасці плануецца распрацоўка тэхналогій павышэння вогнетрываласці і іншых найважнейшых для будаўнічай сферы ўласцівасцяў, для нафтаперапрацоўчай — тэхналогій паглыбленай перапрацоўкі нафты. У сферы машынабудавання ў прыярытэце, у прыватнасці, мікраэлектроніка, лазерныя і святлодыёдныя тэхналогіі, развіццё электра- і беспілотнага транспарту. У Прагнозе прыведзены таксама шэраг перспектыўных тэхналогій для медыцыны, харчовай прамысловасці, аграпрамысловага комплексу, лясной гаспадаркі, энергетыкі — усяго для 15 галін эканомікі і 22 відаў эканамічнай дзейнасці.

У нашай краіны таксама ёсць рэзервы для павышэння навукаёмістасці валавога ўнутранага прадукту.

Навукаёмістасць ВУП Беларусі ў 2023 годзе склала 0,58 % (у 2022-м — 0,47 %). Рэзервам для павышэння гэтага паказчыка з'яўляюцца галіны і віды эканамічнай дзейнасці, у якіх мадэль навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці пакуль яшчэ не да канца выбудавана. У нас няма такіх галін, дзе б не было хоць бы па некалькі праектаў. Але найбольш адпрацаваная мадэль — у сістэме Міністэрства прамысловасці. Навукаёмістасць па галінах — гэтыя суадносіны затрат на даследаванні і распрацоўкі з аб'ёмам створанай дабаўленай вартасці. Па сістэме Мінпрама за мінулы год яна склала 2,6 %».

Кіраўнік ДКНТ падкрэсліў, што навуковая сфера, якая працуе на прамысловасць, пастаянна развіваецца — адсюль і вынік. «Пра гэта кажа доля навукаёмістых праектаў. Калі яшчэ гадоў пяць таму быў паказчык 10—15 %, то цяпер гэта 55—65 %. Яны даюць да 85 % аб'ёму адгружанай прадукцыі ў грашовым выражэнні, — растлумачыў навуковец. — Што ж датычыцца галін, у якіх гэтаму пытанню пакуль удзяляецца недастатковая ўвага, мы іх разглядаем як рэзерв для росту навукаёмістасці ВУП. Для іх у тым ліку падрыхтаваны і наш Комплексны прагноз навукова-тэхнічнага прагрэсу як крыніца праектных ідэй».

Набліжаючы будучыню

# ЗАЗІРНЁМ У ЗАЎТРА БЕЛАРУСІ

## Прагноз навукова-тэхнічнага прагрэсу Беларусі на найбліжэйшыя 20 гадоў ахоплівае 15 галін эканомікі

**Навукоўцамі распрацаваны Комплексны прагноз навукова-тэхнічнага прагрэсу Рэспублікі Беларусь на 2026—2030 гады і на перыяд да 2045 года. Зацверджаны ўрадам дакумент паслужыць асновай для вызначэння прыярытэтных кірункаў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, дапаможа пры распрацоўцы нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь і стратэгій развіцця галін эканомікі.**

Сёння праведзена вялікая работа, і Комплексны прагноз навукова-тэхнічнага прагрэсу з'яўляецца адным з асноўных дакументаў стратэгічнага ўзроўню. Ён дае навукова абгрунтаванае ўяўленне аб магчымых варыянтах навукова-тэхналагічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у сярэднетэрміновым і доўгатэрміновым перыядзе, служыць базісам для арганізацыі і правядзення навукова-тэхнічных даследаванняў, распрацовак і праектаў па стварэнні інавацыйных вытворчасцяў.

Прагноз распрацоўваўся ў тры этапы. Вынікам першага стаў пералік аб'ектаў прагназавання, сфарміраваны экспертнай супольнасцю. На другім этапе гэтым аб'ектам былі прысвоены значэнні параметраў, якія характарызуюць іх запатрабаванасць, праведзена ацэнка ёмістасці сусветнага рынку, ацэнены стан навуковага і вытворчага патэнцыялу нашай краіны. На трэцім этапе распрацоўкі прагнозу для кожнага аб'екта прагназавання было разлічана значэнне індэкса перспектыўнасці і складзены рэйтынгі. Усяго вучоныя ўсебакова разглядзелі 365 аб'ектаў прагназавання ў сярэднетэрміновай перспектыве і 445 — у доўгатэрміновым прагнозе, да 2045 года.

Адным з прыярытэтаў для распрацоўкі і ўкаранення інавацый у Комплексным прагнозе навукова-тэхнічнага прагрэсу Рэспублікі Беларусь на 2026—2030 гады і на перыяд да 2045 года вызначана галіна аховы здароўя і біятэхналогій.

— Перад сістэмай аховы здароўя сёння стаяць наступныя першачарговыя задачы: распрацоўка метадаў дыягностыкі, хуткіх, эфектыўных і недарагіх; метадаў лячэння і рэабілітацыі самага шырокага спектра захворванняў (а для гэтага патрэбны новыя, інавацыйныя лекавыя сродкі, медыцынскія вырабы і клеткавыя прадукты). Нарэшце, першасная і другасная прафілактыка захворванняў, — пералічыў **дырэктар Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Андрэй ГАНЧАРОЎ.**

Сярод задач сферы аховы здароўя, якія патрабуюць першачарговай увагі вучоных, ён таксама вылучыў фарміраванне ў грамадстве інстытута здаровага ладу жыцця і распрацоўку навуковых асноў здароўезберагальных паводзін насельніцтва.

— У цэлым у Комплексным прагнозе для патрэб аховы здароўя прадугледжана рэалізацыя 21 аб'екта прагназавання на сярэднетэрміновы перыяд і 28 — на перыяд да 2045 года, — сказаў Андрэй Ганчароў. — Для фармацэўтычнай прамысловасці прадугледжана рэалізацыя 20 аб'ектаў прагназавання на сярэднетэрміновую перспектыву і 23 — на доўгатэрміновую.

Так, важным кірункам даследаванняў вучоныя назваў распрацоўку тэст-сістэмы для скрынінгу анкалагічных захворванняў на аснове вызначэння пухліннай ДНК і РНК.

— Рост анкалагічных захворванняў назіраецца цяпер па ўсім свеце, — сказаў ён. — Лячэнне такіх захворванняў найбольш эфектыўна на ранніх стадыях. Неабходна як мага раней выявіць пухліну, і для гэтага патрабуюцца новыя метады. Адным з іх з'яўляецца выяўленне пухліннай ДНК.

Яшчэ адным «выклікам для аховы здароўя» Андрэй Ганчароў назваў алергічныя захворванні, распрацоўка метадаў дыягностыкі якіх таксама закладзена ў Прагноз. У планах навукоўцаў — стварэнне новых метадаў дыягностыкі алергічных рэакцый як неадкладнага, так і запаволенага тыпу.

— Вялікая праблема — алергічныя рэакцыі на лекавыя сродкі. Цяпер практычна не існуе метадаў, якія б эфектыўна выяўлялі лекавыя сродкі, што выклікаюць алергію. Іх плануецца распрацаваць у сярэднетэрміновай і доўгатэрміновай перспектывах, — падкрэсліў дырэктар Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН.

Даследаванні будуць весціся і ў кірунку выкарыстання біямедыцынскіх клеткавых прадуктаў. У нас у краіне яны прымяняюцца дастаткова актыўна: у гэтых адносінах Беларусь — лідар у сваім рэгіёне, канстатаваў вучоны.

— Але цяпер выкарыстоўваюцца ў асноўным немадыфікаваныя клеткавыя прадукты. А іх лячэбны патэнцыял, на жаль, пачынае вычэрпвацца, — канкрэтызаваў ён. — Таму патрабуюцца новыя метады генетычнай мадыфікацыі клетак і геномнага рэдагавання для надання клеткам зададзеных уласцівасцяў, лячэбнага патэнцыялу, які будзе дастаткова выяўленым працяглы час. Тады мы зможам ствараць новыя клеткавыя прадукты, новыя тканкаінжынерныя канструкцыі, якія дазволяць лячыць і анкалагічныя, і аўтаімунныя захворванні, і цэлы спектр іншых паталогій.

Сярод кірункаў, закладзеных у Прагноз, — распрацоўка айчынных вакцын супраць вірусных інфекцый на аснове адэнавірусных вектараў, што дасць магчымасць забяспечыць вырашэнне пытання біябяспекі, а ў доўгатэрміновай перспектыве — распрацоўка дэтэктараў па вызначэнні ўзбуджальнікаў інфекцыйных хвароб у рэжыме рэальнага часу: гэта дазволіць прадухіляць развіццё эпідэмій.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**



Блізкая ўлада

# Не толькі правы, але і адказнасць

## Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА выслухаў праблемы грамадзян



**Магіляўчанка паскардзілася ад імя жыхароў мікрараёна на тое, што ў краме № 5 ад ААТ «Фірма «Кадзіна», па яе словах, няма водазабеспячэння, электрычнасці і іншых умоў для нармальнага функцыянавання. Акрамя гэтага, жанчыну турбуе недахоп кадраў у ЖЭУ 21, а таксама стан пешаходнай дарожкі ад клуба «Рэнесанс» да палiклінікі № 7. Ёсць у яе прэтэнзія і да работы «Водаканала». Яна паведаміла, што падвал жылога дома неаднаразова залівала. Грамадзянка сведчыць, што звярталася ў Магілёўскі райвыканкам, але праблемы не вырашаны.**

Адказныя асобы пацвердзілі, што ўсе гэтыя факты маюць месца і па меры магчымасці выпраўляюцца. Мэр Магілёва Аляксандр Студнеў паабяцаў, што ў наступным годзе будзе зроблена пешаходная дарожка ад клуба да паліклінікі і аднаўлены парэнчы ўздоўж яе. Крыху цяжэй выправіць сітуацыю па іншых пытаннях. Напрыклад, крама, па ацэнцы кіраўніцтва раёна, стратная, ёсць складанасці з разлікамі за камунальныя паслугі.

Яшчэ адна магіляўчанка аспрэчыла рашэнне адміністрацыі Ленінскага раёна Магілёва аб зняцці яе з чаргі грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Яна сірата і дзеліць жылплошчу з бабуляй. Спецыялісты ж аргументавалі, што квадратных метраў у той кватэры, дзе яна зарэгістравана, хапае.

Пра патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў паведаміла таксама шматдзетная маці з Краснаполля. Ёй адмаўляюць, матывуючы, што метраў хапае. Заяўніца палічыла, што гэта незаконна. Кіраўніцтва райвыканкама адстойвае сваю пазіцыю.

Жыхар Слаўгарада паскардзіўся, што страціў права на льготную пенсію не па сваёй віне. Пэўны час ён працаваў у аграгаспадарцы трактарыстам, але гэта нідзе ў дакументах не адлюстравана. У іх ён фігуруе як кіроўца. Трактарысты маюць права на льготную пенсію, а вось кіроўцы — не. Мужчыне падказалі, што сваё права ён можа аспрэчыць у судзе. Калі ён знойдзе сведак, якія пацвердзяць факт, льготная пенсія можа быць назначана.

На разгляд узяты і пытанні кіраўнікоў СФГ «АграАўтоНова», якія пажадалі мець пясчаны кар'ер у Асіповіцкім раёне, а таксама зямлі ЗАТ «БНК» і саўгаса «Карытнае», якія не выкарыстоўваюцца. Пытанне з кар'ерам адпала адразу ж, паколькі гаспадарка жадае мець яго не для вытворчасці прадукцыі, а для продажу пяску. Што датычыцца другога, то кіраўнік вобласці параіў скласці бізнес-план, каб было відаць, што ў заяўнікаў хопіць сіл апрацоўваць зямлю, на якую яны прэтэндуюць.

Падводзячы вынікі, старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка адзначыў, што пытанні складаныя і ў іх трэба будзе дэталёва разбірацца.

— Што датычыцца крамы ад аграфірмы «Кадзіна», то яна адназначна павінна існаваць, — заявіў ён. — Я думаю, дастаткова насыціць яе дадатковымі таварамі, і яна будзе ў плюсе. Самае галоўнае, што гэта трэба людзям, бо плодаагароднінная прадукцыя фірмы «Кадзіна» запатрабавана. Што датычыцца жыллёвых пытанняў, то яны заўсёды складаныя. Тым больш калі фігуруе шмат дзетак. Дзесьці ў людзей ёсць дадатковыя плошчы, а яны іх не ўлічваюць. Будзем уважліва разбірацца, пастараемся дапамагчы, але ў рамках дзеючага заканадаўства.

